## СЕМІНАР 9.
## Рэгіёны Беларусі.
## Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні

**Гістарычныя формы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу на беларускіх землях.**

Найважнейшымі дзяржаўнымі ўтварэннямі на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Высокага сярэдневякоўя з'яўляліся Полацкае і Тураўскае княствы. Полацкае княства ўжо з канца X ст. валодала поўнай незалежнасцю ад кіеўскага вялікага князя. Значна пазней (сярэдзіна XII ст.) здабыла незалежнасць Тураўскае княства.

Палітычная структура Полацкага і Тураўскага княстваў, як і ўсіх іншых старажытнарускіх княстваў перыяду палітычнай раздробненасці, заключала ў сабе два ўзроўні: княствы-землі і княствы-воласці. Яшчэ з канца X–XI ст. адбыўся падзел Старажытнай Русі на воласці (найбольш ранняя воласць – гэта як раз Полацкае княства). У літаральным значэнні «воласць» – гэта валоданне князя (ад слова «улада»). Да з'яўлення валасцей прыводзяць адміністрацыйныя рэформы кіеўскіх князёў, якія саджалі на мясцовыя прастолы сваіх сыноў. Пры гэтым у адносінах да ўсёй тэрыторыі Старажытнай Русі ўжывалася паняцце «зямля» – «Руская зямля». Пазней – з сярэдзіны XII ст. – на буйныя княствы-воласці распаўсюджваецца найменне **«землі»**. Так на рэгіянальным узроўні была паўторана структура раней адзінай дзяржавы: зямля, а ўнутры яе – **воласці** (назіранне А.А. Горскага).

Воласці ў Полацкім княстве, магчыма, з'яўляюцца яшчэ пры жыцці Усяслава Брачыславіча (1044–1101). У цэлым на працягу XII – пачатку XIII ст. у Полацкай зямлі вылучыліся, акрамя Полацкай, Віцебская, Менская, Друцкая воласці, а таксама, магчыма, Лукомльская, Ізяслаўская, Лагожская і Барысаўская. Можна адзначыць таксама тэндэнцыю да ператварэння Менскага княства ў самастойную зямлю са сваімі валасцямі (Ізяслаўль, Гарадзец), што выразна праявілася ў дзейнасці менскага князя Глеба Усяславіча (1101–1119).

Слабасцю Полацкай зямлі спяшаліся скарыстацца суседзі: на поўначы – Наўгародская зямля, на ўсходзе – Смаленскае княства, ужо з канца XII ст. Полацк аказваецца цесна звязаным з Літвой. Апынуўшыся у варожым асяроддзі, Полацк вымушаны быў улічваць знешнепалітычны фактар, лавіруючы паміж рознымі сіламі.

Тураўская зямля першапачаткова была часткай Кіеўскага княства, г.зн. яго воласцю. Але па падліках украінскага даследчыка А. Грушэўскага, Тураўская воласць на працягу першых ста гадоў пасля смерці Яраслава Мудрага каля 40 гадоў жыла асобнай жыццём, 60 гадоў – у злучэнні з Кіевам. У цэлым у дачыненні да часу да сярэдзіны XII ст. Тураўская зямля «як асобная адзінка са сваёй княжацкай дынастыяй» – гэта сапраўды «навуковая фікцыя», як сцвярджаў савецкі гісторык М.М. Ціхаміраў.

Выгаднае геаграфічнае становішча Турава на гандлёвым шляху ў Цэнтральную Еўропу, прагрэс у земляробстве і рамястве ўмацоўвалі эканамічную незалежнасць Тураўскай зямлі.

Ужо з канца XII ст. на першае месца сярод гарадоў Тураўскай зямлі выйшаў Пінск. Менавіта гэта дазволіла гісторыкам выкарыстоўваць паняцце Турава-Пінская зямля. Узвышэнне Пінска было звязана менавіта з геаграфічным фактарам. Блізкасць Кіева, барацьба за які з надыходам раздробненасці ўзмацнілася, рабіла вельмі небяспечным становішча тураўскага прастолf. Як былой воласцю Кіеўскай зямлі князі, якія апынуліся на стале ў Кіеве, імкнуліся па сваім меркаванні распарадзіцца Туравам. Больш за тое, геапалітычнае становішча Турава, які навісаў над Кіевам, прыводзіла да таго, што кіеўскія князі жадалі бачыць на тураўскім прастоле сваіх саюзнікаў або васалаў. Так небяспечнае становішча Турава прывяло да таго, што старэйшы князь гэтай зямлі перайшоў у Пінск, які займаў не менш выгаднае становішча на гандлёвым шляху ў Цэнтральную Еўропу.

У склад Тураўскай зямлі ўваходзілі Тураўская, Пінская і Гарадзецкая воласці, з часам вылучылася таксама Дубровіцкая воласць. Пазней, у пачатку XIII ст., ёсць сведчанні аб прыналежнасці да Турава-Пінскай зямлі Чартарыйскай воласці.

Акрамя Полацкага і Тураўскага княстваў у межах сучаснай Рэспублікі Беларусь у старажытнарускі перыяд у якасці перыферыйных княстваў на мяжы з балцкімі землямі паўсталі Гарадзенскае (найбольш старажытнае, існавала з першай паловы XII ст.), Ваўкавыскае, Слонімскае і Навагародскае княствы (пісьмовыя сведчанні аб трох апошніх адносяцца да сярэдзіны XIII ст.). Асаблівасцю гэтых дзяржаўных утварэнняў была іх цесная сувязь з Кіевам, у дачыненні да «далітоўскага» перыяду іх можна разглядаць як воласці Кіеўскай зямлі. Магчыма, у Гарадзенскім княстве зацвердзіліся нашчадкі князя-ізгоя.

Шэраг іншых сучасных беларускіх тэрыторый уваходзіў у склад Чарнігаўскага, Смаленскага, Валынскага (з 1199 г. – Галіцка-Валынскага) і Кіеўскага княстваў. Для іх палітычнага развіцця былі характэрны агульныя для ўсяго старажытнарускага рэгіёну з'явы – далейшае драбленне на княствы-воласці і міжусобная барацьба.

Межы асобных княстваў-зямель і княстваў-валасцей ў старажытнарускі перыяд не былі дакладна вызначаны і тым больш маркіраваны. Прыналежнасць да той ці іншай воласці вызначалася данніцкімі абавязацельствамі насельніцтва. Паселішчы, насельніцтва якіх выплачвала даніну пэўнаму («свайму») князю, складалі тэрыторыю княства. Для арганізацыі збору даніны з ініцыятывы княжацкай улады з сярэдзіны X ст. ствараюцца спецыяльныя пункты – пагосты. Менавіта ў пагосты непасрэдныя вытворцы, аб'яднаныя ў абшчыны-верві, павінны былі перадаваць частку вырабленых матэрыяльных каштоўнасцей. У цэлым вертыкальную структуру падаткова-данніцкай сістэмы старажытнарускіх княстваў можна прадставіць наступным чынам:

**непасрэдны вытворца – абшчына (верв) – пагост – горад (цэнтр воласці) – горад (цэнтр зямлі)**

Мяркуецца, што пагосты з прыналежным да іх наваколлем (некалькі сельскіх паселішчаў), з'яўляліся прамежкавым звяном паміж насельніцтвам і воласцю («княствам»).

Арганізацыя збору падаткаў-даніны з'яўлялася найважнейшай задачай мясцовых органаў улады.

На працягу XIII–XIV стст. да Вялікага Княства Літоўскага быў далучаны шэраг княстваў былой Старажытнай Русі. Працэс уключэння зямель у склад ВКЛ ажыццяўляўся рознымі шляхамі: у адных выпадках – ваеннай сілай, у іншых – шляхам дынастычных шлюбаў, у трэціх – на падставе дамовы паміж князямі ці паміж кіруючымі коламі дзвюх дзяржаў.

Тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага падчас найбольшага пашырэння складала 900 тыс. км$^2$.

Дзяржаўны лад і адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне складаліся па меры фарміравання самой дзяржавы. Першапачаткова дзяржаўны лад ВКЛ характарызаваўся дзяленнем краіны на дзве часткі: цэнтральную (галоўную) і землі мяжуючыя («якія прыслухоўваюцца»). Адносіны паміж цэнтрам і мяжуючымі землямі будаваліся на асабістай залежнасці князёў асобных зямель ад вялікага князя, г.зн. на аснове сюзерэнітэту-васалітэту.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне дзяржавы ў другой палове XIII – XIV ст. было прадстаўлена ранейшымі межамі, якія існавалі паміж асобнымі княствамі да стварэння ВКЛ. Захаванне старога адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення, мясцовых органаў кіравання, мясцовых прававых звычаяў, судоў сведчыць пра тое, што дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага характарызаваўся наяўнасцю шырокай аўтаноміі асобных зямель-княстваў, якія ўваходзілі ў яго склад. Разам з тым гэтыя землі не былі цалкам самастойнымі. Іх насельніцтва падпарадкоўвалася цэнтральным органам і несла вызначаныя агульнадзяржаўныя павіннасці.

Напачатку XVI ст. у ВКЛ была праведзена адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа, у выніку якой было заснавана яшчэ 5 ваяводстваў – Віцебскае, Полацкае, Наваградскае, Смаленскае і Падляшскае. Віленскі сойм 1565–1566 гг. падзяліў ВКЛ на 13 ваяводстваў і 30 паветаў, дзе кіравалі намеснікі вялікага князя – ваяводы і старасты. Рэформа 1565–1566 гг. не здолела цалкам пераадолець хаос у адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні ВКЛ. У тэрыторыі паветаў і ваяводстваў укліньваліся каралеўскія эканоміі, існавалі таксама воласці, войтаўствы, староствы, графствы, ардынацыі. Тым не менш, рэформа была перспектыўным крокам, накіраваным на далейшую цэнтралізацыю. Адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа 1565–1566 гг. павінна была падрыхтаваць аб'яднанне Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польшча ў адзіную дзяржаву (што неўзабаве адбылося па ўмовах Люблінскай уніі 1569 г.); пазделам усей тэрыторыі дзяржавы на ваяводствы і паветы адбывалася ўніфікацыя з адміністрацыйным падзелам у Польшчы. У выніку беларускія землі ў складзе ВКЛ былі падзелены на наступныя ваяводствы і паветы: Берасцейскае, Віленскае, Віцебскае, Менскае, Мсціслаўскае, Навагародскае, Полацкае, Троцкае.

Пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі іх адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел спазнаў значныя змены. У пачатку XIX ст. у выніку новай рэформы быў уведзены той адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, які пратрымаўся без змен амаль 40 год – створаны Віленская, Віцебская, Гродзенская, Мінская і Магілёўская **губерні**. Віцебская і Магілёўская губерні ўвайшлі ў склад Беларускага **генерал- губернатарства**,

Віленская, Гродзенская і Мінская – Літоўскага. У 1863 г. беларускія губерні былі аб'яднаны пад агульным кіраўніцтвам віленскага генерал-губернатара.

Пасля падпісання Тыльзіцкага мірнага дагавора (1807 г.) Расійскай імперыі была перададзена частка зямель былой Рэчы Паспалітай, якія ўвайшлі ў склад утворанай у 1808 г. Беластоцкай вобласці. У выніку гэтай падзеі невялікая частка сёняшняй Гродзеншчыны трапіла ў склад Расійскай імперыі. Указам ад 18 снежня 1842 г. былі зменены адміністрацыйныя межы губерняў: тэрыторыя Беластоцкай вобласці перададзена ў склад Гродзенскай губерні, створана Ковенская губерня, частка Гродзенскай губерні ўвайшла ў склад Віленскай (Лідскі павет) і Мінскай (Навагрудскі павет) губерняў, Дзісненскі і Вілейскі паветы перадаваліся з Мінскай у Віленскую губерню. Уведзены адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел практычна без змен пратрымаўся да пачатку XX ст. У гэты час у сёняшніх дзяржаўных межах Беларусі існавалі 35 паветаў (усяго ў адміністрацыйных граніцах пяці беларускіх губерняў – 47 паветаў).

Губерні як больш буйныя адзінкі падзяляліся на паветы, якія ў сваю чаргу -- на валасці. Як адміністрацыйная адзінка воласць з'явілася ў Расійскай імперыі ў гады праўлення імператара Паўла I для кіравання казёнными сялянамі. Пасля адмены прыгоннага права (1861 г.) такая форма кіравання была пашырана на былых прыватнаўласніцкіх сялян. Фактычна гэтым рашэннем завяршылася фарміраванне адзінай сістэмы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага кіравання **«губерня – павет – воласць».** Воласць уяўляла сабой у той час ніжэйшую адміністрацыйную адзінку сялянскага самакіравання, якая ўтваралася з сумежных сельскіх таварыстваў (грамадстваў), часта ў межах аднаго царкоўнага прыхода, з колькасцю насельніцтва ад некалькіх соцень да некалькіх тысяч чалавек.

Губерню ўзначальваў губернатар, які меў абавязак нагляду за ўсімі ўстановамі ў губерні. Свае паўнамоцтвы ён павінен быў здзяйсняць калегіяльна, з дапамогай губернскага праўлення, якое займалася агульным адміністрацыйным кіраваннем губерняй, абнародавала законы, указы, распараджэнні імператара, Сената і іншых вышэйшых дзяржаўных устаноў, здзяйсняла нагляд за іх выкананнем, вырашала справы, якія не патрабавалі судовага разбіральніцтва і інш.

*Усталяванне савецкай улады*, стварэнне беларускай савецкай дзяржавы на пачатку не перадвызначыла змены ў назве беларускіх рэгіёнаў. Захоўваўся падзел на губерні і паветы. У Заходняй Беларусі згодна канстытуцыі Польшчы вызначаліся ваяводствы і гміны.

У пачатку 1920-х гг. мясцовыя органы ўлады былі прадстаўлены павятовымі і валаснымі з'ездамі саветаў, гарадскімі і сельскімі саветамі і іх выканаўчымі камітэтамі. У выканкамах былі створаны галіновыя аддзелы (земляробства, юстыцыі, сацыяльнага забеспячэння, народнай асветы, працы, прадуктаў харчавання, дарожна-будаўнічы, аховы здароўя і інш), якія, па сутнасці, сталі падведамаснымі ўстановамі адпаведных наркаматаў. Наркаматы мелі права даваць ўказанні адпаведнаму аддзелу выканкамаў любога ўзроўню. Праца выканкамаў як калегіяльных органаў кіравання вялася фармальна. Са складу выканкама абіраўся прэзідыум, які і вырашаў усе важныя для грамадзян пытанні.

У сярэдзіне 1920-х гг у БССР было праведзена раянаванне. Сельсаветы абіраліся ад вёсак, хутароў і іншых населеных пунктаў (ад 2 да 4 тысяч, 1 дэпутат на кожныя 200 чалавек насельніцтва). У сельскіх мясцовасцях з малой шчыльнасцю насельніцтва (на тэрыторыі з колькасцю не менш за 500 чалавек) маглі быць створаны з дазволу акруговага выканаўчага камітэта сельсаветы з колькасцю дэпутатаў не менш за 10 чалавек. У 1924 г. на тэрыторыі БССР было скасавана ранейшае і зацверджана новае адміністрацыйна-тэрытарыяльная дзяленне – акругі з падзелам на раёны, пасля акругі былі скасаваны, уведзена абласное дзяленне. Да верасня 1939 г. БССР складалася з 5 абласцей: Віцебскай, Гомельскай, Мінскай, Магілёўскай і Палескай.

20 верасня 1944 г. былі створаны новыя вобласці: Бабруйская, Гродзенская, Полацкая, Маладзечанская. Такі **адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на 12 абласцей праіснаваў да 1954 г.**

З сярэдзіны 1950-х гг. да сярэдзіны 1960-х гг. адбылася чарговая рэарганізацыя адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР. 8 студзеня 1954 г. былі скасаваны Баранавіцкая, Бабруйская, Пінская, Палеская і Полацкая вобласці, іх раёны былі пераразмеркаваны паміж іншымі абласцямі. 20 студзеня 1960 г. была скасавана Маладзечанская вобласць.

***Сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь.***

Яшчэ ў 1960-я гг. у БССР усталяваўся адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, які ў агульных рысах захоўваецца да нашых дзён. Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь тэрыторыя Беларусі адзіная і неадчужальная (арт. 9). У адміністрацыйных адносінах Рэспубліка Беларусь падзяляецца на тэрыторыю сталіцы – горад Мінск – і тэрыторыі абласцей. У цяперашні час Беларусь складаецца з 6 абласцей:

Брэсцкай (з цэнтрам у горадзе Брэсце),

Віцебскай (з цэнтрам у горадзе Віцебску),

Гомельскай (з цэнтрам у горадзе Гомелі),

Гродзенскай (з цэнтрам у горадзе Гродна),

Мінскай (з цэнтрам у горадзе Мінску), Магілёўскай (з цэнтрам у горадзе Магілёве).

У сваю чаргу вобласці падзяляюцца на тэрыторыі раёнаў і гарадоў абласнога падпарадкавання. Трэці адміністрацыйна-тэрытарыяльны ўзровень складаюць тэрыторыі, на якія падзяляюцца раёны: тэрыторыі гарадоў раённага падпарадкавання, пасёлкаў і сельсаветаў. Па стане на 1 студзеня 2020 г.

колькасць раёнаў у Рэспубліцы Беларусь складае 118:

16 раёнаў – у Брэсцкай вобласці,

21 – у Віцебскай,

17 – у Гродзенскай,

21 – у Гомельскай,

22 – у Мінскай,

21 – у Магілёўскай.

Што датычыцца тэрыторый населеных пунктаў, якія не з'яўляюцца

адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі, яны разам з іншымі тэрыторыямі ўваходзяць у прасторавыя межы сельсаветаў.

Да ліку тэрытарыяльных адзінак Беларусі адносяцца населеныя пункты, у якіх не створаны мясцовыя саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, акрамя таго – тэрыторыі спецыяльнага рэжыму выкарыстання: нацыянальныя паркі, запаведнікі, заказнікі, тэрыторыі помнікаў прыроды, тэрыторыі абарончага прызначэння і інш.

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь пытанні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы ўваходзяць у кампетэнцыю Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (арт. 97).

У сувязі з тым, што існуючы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь усталяваўся больш за палову стагодзя таму, калі існавала іншая сацыяльна-эканамічная (арыентацыя на калектывізацыю і індустрыялізацыю) і грамадска-палітычная (зрастанне дзяржаўнага апарату з партыйным) сітуацыя, узнікае пытанне аб магчымым яго рэфармаванні. Адзначаецца таксама існаванне значнага адрознення асобных раёнаў Беларусі па колькасці насельніцтва, узроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця і забяспечаннасці інфрастуктурай. 14 раённых цэнтраў змяшчаюцца на адлегласці больш за 200 км ад свайго абласнога цэнтра (Паставы, Ляхавічы, Лельчыцы і інш.), а 16 райцэнтраў знаходзяцца бліжэй да Мінска, чым да свайго абласнога цэнтра (Асіповічы, Ашмяны і інш.).

Апошні раз буйное адміністрацыйнае пераўтварэнне ў краіне адбылося ў 1989 г.: у Горацкі раён Магілёўскай вобласці перасялілася шмат жыхароў з адселеных з-за аварыі на Чарнобыльскай АЭС вёсак, таму са складу раёна вылучылі новы – Дрыбінскі. Між тым некаторыя пераўтварэнні ў сферы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Беларусі ўжо неаднаразова ажыццяўляліся ў апошнія гады. Так, у Мінскай вобласці ў 2006 г. змены адбыліся ў Салігорскім, Пухавіцкім, Мядзельскім раёнах; у 2007 г. – у Клецкім і Бярэзінскім; у 2009 г. былі зменены тэрыторыі 32 сельсаветаў. Пастаянна змяняюцца межы гарадоў (асабліва Мінска). Адбываліся дробныя змены і дзяржаўнай граніцы: напрыклад, за апошнія гады некалькі разоў мянялі лінію граніцы з Украінай – у Лельчыцкім і Лоеўскім раёнах.

Найбольш істотныя змены адбыліся ў 2019 г. Згодна з указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 сакавіка 2019 г. змяніліся граніцы Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей (уступіў у сілу з 1 снежня 2019 г.). Гэтыя змены датычацца 55 раёнаў (16 – у Брэсцкай вобласці, 22 – у Мінскай і 17 – у Гродзенскай); патрабавалася прывесці ў адпаведнасць межы сельскіх саветаў, якія знаходзіліся на стыку дадзеных абласцей і раёнаў. Неабходнасць у гэтых пераўтварэннях была выклікана ажыццяўлёнымі раней меліярацыйнымі і іншымі гаспадарчымі работамі, будаўніцтвам аб’ектаў транспартнай інфраструктуры, што ў выніку прывяло да несупадзення адміністрацыйных межаў з цвёрдымі контурамі мясцовасці (рэкамі, меліярацыйнымі каналамі, дарожнай сеткай, ляснымі масівамі, прасекамі і інш.). Найбольш буйная змена заключалася ў перанясенні вёскі Карытніца, якая была адзіная ў Лідскім раёне на левым беразе Нёмана, у Дзятлаўскі раён.

**Функцыі і паўнамоцтвы мясцовага кіравання і самакіравання.**

На ўсіх узроўнях публічнай улады дзяржаўныя органы выконваюць адну

і тую ж мэту – найбольш эфектыўна распарадзіцца дэлегаванай грамадствам уладай для рашэння агульнадзяржаўных задач. Асновы прававога становішча органаў мясцовага кіравання і самакіравання, асобных форм непасрэднай дэмакратыі замацаваны ў Законе ад 4 студзеня 2010 г. «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь». Агульнай арганізацыі мясцовага кіравання і самакіравання прысвечаны Раздзел V (артыкулы 117–124) Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. У адпаведнасці з заканадаўствам у Рэспубліцы Беларусь органамі мясцовага кіравання і самакіравання з'яўляюцца мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, мясцовыя рэферэндумы, сходы і іншыя формы прамога ўдзелу ў дзяржаўных і грамадскіх справах.

Мясцовыя Саветы дэпутатаў выбіраюцца жыхарамі адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак (вёскі, горада, раёна, вобласці) тэрмінам на чатыры гады. Саветы дэпутатаў працуюць у форме сэсій, якія збіраюцца не радзей аднаго разу ў квартал. На сэсіях дэпутаты мясцовых Саветаў зацвярджаюць праграмы эканамічнага і сацыяльнага развіцця свайго горада або раёна, распараджаюцца выдаткамі і даходамі мясцовых бюджэтаў, камунальнай уласнасцю, усталёўваюць мясцовыя падаткі і зборы, абмяркоўваюць іншыя пытанні, звязаныя з развіццём сваёй тэрыторыі. У камунальнай уласнасці, як правіла, знаходзіцца маёмасць дзяржаўных органаў раёна, горада ці іншай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, жыллёвы фонд і жыллёва-камунальная гаспадарка падведамнай тэрыторыі, а таксама прамысловыя, будаўнічыя, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, прадпрыемствы гандлю, бытавога абслугоўвання насельніцтва і транспарту, іншыя прадпрыемствы, арганізацыі, установы аховы здароўя, адукацыі, культуры, фізічнай культуры і спорту.

Па пытаннях, разгледжаных на сесіях, Савет дэпутатаў прымае рашэнні. Саветы дэпутатаў падсправаздачныя ў сваёй дзейнасці грамадзянам, якія пражываюць на адпаведнай тэрыторыі, і адказныя перад імі. Дзейнасць Саветаў дэпутатаў забяспечваецца за кошт сродкаў адпаведнага мясцовага бюджэту.

Увогуле ў функцыянаванні мясцовага самакіравання ў дзяржаве знаходзіць выяўленне права грамадзян на мясцовае самакіраванне – адзін з фундаментальных элементаў дэмакратычнай дзяржавы, выяўляецца народаўладдзе. Пры гэтым мясцовае кіраванне зыходзіць з таго, што інтарэсы калектыву грамадзян на мясцовым узроўні атрымліваюць прыярытэт над інтарэсамі як асобнага грамадзяніна, так і грамадства ў цэлым.

Рэалізацыя кіраўніцкіх функцый мясцовымі органамі ў нашай краіне ажыццяўляецца як у форме мясцовага кіравання, так і ў форме самакіравання. Сістэма мясцовых органаў кіравання ў Рэспубліцы Беларусь складаецца з абласных, гарадскіх, раённых, пасялковых і сельскіх выканкамаў, а таксама мясцовых адміністрацый. Выканкамы і мясцовыя адміністрацыі ўваходзяць у адзіную сістэму органаў выканаўчай улады (у адрозненне ад органаў мясцовага самакіравання, сярод якіх, напрыклад, мясцовыя Саветы дэпутатаў з'яўляюцца прадстаўнічымі органамі).

Выканаўчым і распарадчым органам на тэрыторыі вобласці, раёна, горада, пасёлка, сельсавета з’яўляецца выканаўчы камітэт з правамі юрыдычнай асобы. Вылучаюць тры віды выканаўчых камітэтаў:

– **першасны ўзровень – сельскія, пасялковыя, гарадскія (гарадоў раённага падпарадкавання);**
– **базавы ўзровень – гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання);**
– **абласны ўзровень – абласныя і Мінскі гарадскі.**

Такім чынам, асноўным выканаўчым і распарадчым органам на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі з’яўляецца мясцовы выканкам – калегіяльны орган кіравання агульнай кампетэнцыі. Ён забяспечвае вырашэнне ўсіх пытанняў кіравання на адпаведнай тэрыторыі.

Выканаўчы камітэт складаецца са старшыні выканкама, яго намеснікаў, кіраўніка спраў (або сакратара) і членаў выканаўчага камітэта. Першы намеснік старшыні, намеснікі старшыні, кіраўнік спраў і члены абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады старшынёй выканаўчага камітэта па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Першы намеснік старшыні, намеснікі (намеснік) старшыні, кіраўнік спраў (сакратар) і члены раённага, гарадскога, пасялковага, сельскага выканаўчых камітэтаў прызначаюцца старшынёй адпаведнага выканаўчага камітэта па ўзгадненні з вышэйстаячым выканаўчым камітэтам.

Абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты падсправаздачныя і падкантрольныя Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь па пытаннях, што ўваходзяць у кампетэнцыю Урада Рэспублікі Беларусь, выканаўчыя камітэты пярвічнага і базавага ўзроўняў – Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і вышэйстаячым выканаўчым і распарадчым органам. Выканаўчы камітэт адказны перад адпаведным Саветам па пытаннях, аднесеных да кампетэнцыі Савета.

У межах сваіх паўнамоцтваў выканаўчы камітэт прымае рашэнні, якія зацвярджаюцца простай большасцю галасоў ад устаноўленага складу выканаўчага камітэта, падпісваюцца старшынёй выканаўчага камітэта і кіраўніком спраў (сакратаром) выканаўчага камітэта. Пасяджэнні выканаўчага камітэта склікаюцца старшынёй выканаўчага камітэта па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу на месяц і лічацца правамоцнымі, калі ў іх прымае ўдзел не менш за 2/3 членаў ад устаноўленага складу выканаўчага камітэта. Выканаўчы камітэт па меры неабходнасці, але не радзей аднаго разу на год дакладвае аб сваёй дзейнасці Савету, а таксама інфармуе грамадзян на сходах працоўных калектываў і па месцы жыхарства.

Што датычыцца канкрэтнага выяўлення дзейнасці выканаўчага камітэта, ён распрацоўвае і ўносіць для зацвярджэння ў Савет схему кіравання мясцовай гаспадаркай і камунальнай уласнасцю, прапановы па арганізацыі аховы грамадскага парадку і абароны правоў грамадзян; распрацоўвае і ўносіць для зацвярджэння ў Савет праекты праграм эканамічнага і сацыяльнага развіцця, мясцовага бюджэту, прымае меры па ажыццяўленні праграм і выкананні мясцовага бюджэту, прадстаўляе Савету справаздачы аб іх выкананні;

забяспечвае на адпаведнай тэрыторыі выкананне Канстытуцыі і законаў, рашэнняў Савета і рашэнняў вышэйстаячых дзяржаўных органаў, прынятых у межах іх кампетэнцыі. Акрамя таго выканаўчы камітэт прымае рашэнні аб стварэнні, рэарганізацыі і ліквідацыі прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў і аб'яднанняў камунальнай уласнасці, па пытаннях сваёй дзейнасці стварае камісіі, вызначае іх паўнамоцтвы і кіруе іх дзейнасцю; аказвае ніжэйстаячым выканаўчым камітэтам і мясцовым адміністрацыям неабходную дапамогу; вырашае ўскладзеныя на яго заканадаўствам задачы па арганізацыі выбараў і рэферэндумаў, а таксама абмеркаванні іншых найважнейшых пытанняў мясцовага і рэспубліканскага значэння. На выканаўчыя камітэты ўскладзены таксама шэраг іншых паўнамоцтваў.

Рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія не адпавядаюць заканадаўству, могуць быць скасаваны вышэйстаячымі Саветамі дэпутатаў, Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, а таксама прыпыняюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў, якія абмяжоўваюць ці парушаюць правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, а таксама ў іншых прадугледжаных заканадаўствам выпадках, могуць быць абскарджаны ў судовым парадку (артыкул 122 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).

Выканаўчы камітэт непасрэдна кіруе дзейнасцю ўсіх сваіх упраўленняў, аддзелаў, іншых органаў. Непасрэдна і праз падпарадкаваныя яму органы выканкам накіроўвае і кантралюе дзейнасць аб'ектаў мясцовай гаспадаркі па пытаннях, пералічаных у заканадаўстве. Да ліку аддзелаў і ўпраўленняў выканкамаў адносяцца мясцовыя органы галіновай або міжгаліновай кампетэнцыі (напрыклад, фінансавы аддзел, аддзел сацыяльнага забеспячэння і г.д.). Яны ўзначальваюцца начальнікамі ці загадчыкамі. Гэта адзінаначальныя органы. У пасялковых, сельскіх выканкамах аддзелы і ўпраўленні не прадугледжаны. Пры выканкамах ствараюцца рознага роду камісіі: адміністрацыйныя, па справах непаўналетніх, назіральныя. Гэта юрысдыкцыйныя і наглядна-кантрольныя органы, якія могуць разглядаць справы аб адміністрацыйных правапарушэннях і накладаць адміністрацыйныя спагнанні за іх здзяйсненне і сачыць за выкананнем правілаў у галіне выканаўчай і распарадчай дзейнасці.

У сістэме выканаўча-распарадчых органаў існуюць і іншыя мясцовыя органы дзяржаўнага кіравання, якія арганізацыйна не падпарадкоўваюцца выканкамам. Гэта мясцовыя тэрытарыяльныя органы Міністэрства абароны, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Міністэрства па падатках і зборах і інш. Утвараюцца такія мясцовыя органы кіравання адпаведнымі міністэрствамі. У сваёй дзейнасці па кіраванні непасрэдна падпарадкаванымі аб'ектамі гэтыя органы супрацоўнічаюць з адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі.

Асобна трэба казаць аб мясцовай адміністрацыі, якая з'яўляецца выканаўчым і распарадчым органам на тэрыторыі раёна ў горадзе. Мясцовыя адміністрацыі валодаюць правам юрыдычнай асобы, уваходзяць у сістэму органаў выканаўчай улады і адносяцца да органаў мясцовага кіравання. Мясцовая адміністрацыя – калегіяльны орган агульнай кампетэнцыі, які складаецца з кіраўніка мясцовай адміністрацыі, яго намеснікаў і членаў мясцовай адміністрацыі. Мясцовыя адміністрацыі былі створаны пасля скасавання ў гарадах раённых Саветаў дэпутатаў і іх органаў у адпаведнасці з

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 1995 г. №383 «Аб правядзенні рэформы органаў мясцовага кіравання і самакіравання». Паўнамоцтвы мясцовай адміністрацыі шмат у чым супадаюць з паўнамоцтвамі раённых выканаўчых камітэтаў. Кіраўнік мясцовай адміністрацыі прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або ва ўстаноўленым парадку. Мясцовая адміністрацыя падсправаздачная і падкантрольная гарадскому выканаўчаму камітэту, які зацвярджае яе структуру і штатную колькасць. Мясцовая адміністрацыя не радзей аднаго разу на год робіць справаздачу перад гарадскім выканаўчым камітэтам, а таксама інфармуе грамадзян аб сваёй дзейнасці.

Такім чынам, органы мясцовага кіравання ўключаюць ў сябе **мясцовыя выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі, аддзелы і ўпраўленні выканкамаў (мясцовых адміністрацый).** Дадзеныя органы ажыццяўляюць выканаўчую ўладу на тэрыторыі вобласці, раёна, горада, пасёлка, сельсавета. Увогуле галоўнай мэтай іх дзейнасці з'яўляецца вырашэнне пытанняў мясцовага значэння з улікам агульнадзяржаўных інтарэсаў і інтарэсаў насельніцтва, якое пражывае на адпаведнай тэрыторыі.

**Гістарычная рэтраспектыва развіцця палітычных партый.**
**Пераход ад аднапартыйнай сістэмы да шматпартыйнасці.**

Адмена III з'ездам народных дэпутатаў СССР у сакавіку 1990 г. канстытуцыйнага палажэння (арт. 6 Канстытуцыі СССР), якое замацоўвала аднапартыйнасць і манаполію КПСС, адкрыла магчымасць для прызнання розных нефармальных аб'яднанняў легітымнымі палітычнымі структурамі і стварэння палітычных партый. Гэтаму спрыяў і прыняты 9 кастрычніка 1990 г. Закон СССР «Аб грамадскіх аб'яднаннях» -- першы крок у прававой рэгламентацыі дзейнасці партый. Ён надаў дадатковы імпульс, які ішоў яшчэ з другой паловы 1980-х гг., працэсу іх зараджэння. У адпаведнасці з законам для стварэння палітычнай партыі патрабавалася не меней за 100 членаў. Фактычна пачатак фарміравання палітычных партый Беларусі звязаны са з'яўленнем і станаўленнем у 1986--1987 гг. рознага роду дыскусійных клубаў і нефармальных арганізацый («Талака», «Спадчына», «Тутэйшыя», «Мартыралог Беларусі» і інш.). Іх сацыяльнай асновай стала творчая інтэлігенцыя і моладзь. На мітынгах і сходах яны выступалі за дэмакратызацыю грамадства, прававую дзяржаву, свабоду слова, друку, адраджэнне нацыянальнай культуры, наданне беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай мовы, плюралізм розных форм уласнасці, эканамічную незалежнасць і суверэнітэт Беларусі.

У кастрычніку 1988 г. на базе нефармальных аб'яднанняў быў створаны аргкамітэт Беларускага народнага фронту (БНФ) за перабудову «Адраджэньне», устаноўчы з'езд якога адбыўся ў чэрвені 1989 г. у Вільні. Пасля II з'езду (сакавік 1991 г., Мінск) БНФ пераўтварыўся ў партыю з вертыкальнай арганізацыйнай структурай, індывідуальным членствам, выплатай узносаў, утварэннем сваіх суполак у працоўных калектывах. Ўлучыўшыся ў барацьбу за ўладу і прыняўшы ўсе атрыбуты палітычнай партыі, БНФ перайшоў на антыкамуністычныя пазіцыі, стаў каардынуючым цэнтрам ўсіх апазіцыйных сілаў. У першыя гады незалежнасці Беларусі ён заняў дамінуючае становішча ў палітычным спектры грамадства і меў самы

высокі рэйтынг за ўвесь перыяд сваёй дзейнасці. У пачатку 90-х гг. XX ст. ён дасягаў 40%.

Шматпартыйнасць у Беларусі ўзнікла на хвалі перабудоўчых змен. XIX канферэнцыя КПСС (1988 г.) фактычна дала дабро на існаванне іншых партый у краіне. У Беларуси першай такой палітычнай партыяй стала Аб'яднаная дэмакратычная партыя (з 1990 г. да пачатку 1995 г., калі змяніла сваю назву на «Нацыянальна-дэмакратычная партыя беларусаў»).

У хуткім часе ўзніклі Беларуская сялянская партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі, Беларускі хрысціянска-дэмакратычны саюз.

У жніўні 1991 г. пасля правалу путчу ГКЧП Вярхоўны Савет БССР прыпыніў дзейнасць Кампартыі Беларусі. У снежні 1991 г. была створана Партыя камуністаў Беларуская (ПКБ), зарэгістраваная ў маі 1992 г. У лютым 1993 г. парламент адмяніў сваё рашэнне аб прыпыненні дзейнасці КПБ, пасля чаго ў рэспубліцы існавалі дзве камуністычныя партыі.

Важную ролю ў станаўленні партыйнай сістэмы ў краіне адыгралі прэзідэнцкія выбары ў ліпені 1994 г. У перыяд перадвыбарчай кампаніі рэзка ўзрасла актыўнасць палітычных партый, яны набылі практычны вопыт удзелу ў выбарах. З 21 зарэгістраванай палітычнай партыі ў прэзідэнцкіх выбарах удзельнічалі 6. Знамянальнай падзеяй у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі стала прыняцце Вярхоўным Саветам Закона «Аб палітычных партыях» у кастрычніку 1994 г. У ім упершыню ў гісторыі беларускага заканадаўства быў замацаваны парадак утварэння і дзейнасці палітычных партый. На падставе Закона мінімальная колькасць членаў, неабходная для рэгістрацыі палітычнай партыі, было павялічана са 100 да 500 чалавек.

Прыняцце Закона «Аб палітычных партыях» дазволіла пазначыць месца палітычных партый у палітычнай сістэме Беларусі, іх правы і ўмовы дзейнасці; ўзаконіць фінансавыя і матэрыяльныя крыніцы партыйных структур; зафіксаваць прынцыпы ўзаемаадносін партый з органамі дзяржаўнай улады; пазначыць асноўныя аспекты іх удзелу ў выбарчых кампаніях, у дзейнасці прадстаўнічых і заканадаўчых органаў; рэгламентаваць працэдуру ліквідацыі палітычнай партыі. У Закон неаднаразова ўносіліся змены і дапаўненні, а ў ліпені 2005 г. ён быў прыняты ў новай рэдакцыі.

Пасля рэферэндуму 1996 г. і роспуску Вярхоўнага Савета 13-га склікання колькасць палітычных партый у рэспубліцы скарацілася, ішоў інтэнсіўны працэс іх рэарганізацыі. Разам з тым некаторыя партыі існавалі толькі на паперы, не мелі сярод насельніцтва сур'ёзнай сацыяльнай падтрымкі, арганізацыйных звёнаў на месцах, не вялі ніякай працы. Згодна з пастановай Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь сталі лічыцца недзеючымі Гуманітарная партыя, Беларускі навукова-вытворчы кангрэс,
Беларуская партыя аматараў піва і інш.

На працэс фарміравання шматпартыйнасці ў Беларусі значны ўплыў аказаў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1999 г. «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў і грамадскіх аб'яднанняў», у адпаведнасці з якім была праведзена іх перарэгістрацыя.

**Нарматыўна-прававая база дзейнасці партый і грамадскіх аб’яднанняў.**

Часткай механізму рэалізацыі правоў грамадзян на выказванне сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў і поглядаў, а таксама найважнейшым элементам дэмакратычнай палітычнай сістэмы з’яўляюцца **палітычныя партыі** і іншыя формы грамадзянскай самаарганізацыі. Грамадзяне, а часам таксама замежнікі і асобы без грамадзянства могуць ствараць і ўдзельнічаць у дзейнасці розных свецкіх некамерцыйных аб’яднанняў: палітычных партый, грамадскіх арганізацый, масавых рухаў, арганізацый, ініцыятыў грамадскай самадзейнасці і рознага роду самакіравання. Падобныя формы грамадзянскай актыўнасці спрыяюць рэалізацыі грамадзянамі свабоды меркаванняў, перакананняў і іх вольнаму выражэнню, што адпавядае палажэнням Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах 1966 г. У Канстытуцыі змяшчаецца палажэнне тым, што «Палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб’яднанні, дзейнічаючы ў рамках Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, садзейнічаюць выяўленню і выказванню палітычнай волі грамадзян, удзельнічаюць у выбарах» (арт. 5).

Асноўныя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць пытанні стварэння і дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў у Рэспубліцы Беларусь:

--Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (арт. 4, 5, 36, 86);

--Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь;

--Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прафесійных саюзах» (прыняты 22.04.1992 г.);

--Закон Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (прыняты 4.10.1994 г.);

--Закон Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях» (прыняты 5.10.1994 г.);

--Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №2 «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб’яднанняў» (прыняты 26.1.1999 г.).

Унутраная арганізацыя, структура і напрамкі дзейнасці палітычных партый, грамадскіх арганізацый сацыяльна-эканамічнага і культурнага характару (напрыклад, прафсаюзаў, саюзаў жанчын ці аб’яднанняў нацыянальных меншасцей) звычайна рэгулююцца іх статутамі -- дакументамі, якія прымаюцца самімі гэтымі аб’яднаннямі на іх з’ездах, канферэнцыях. Дзяржава не ўмешваецца ва ўнутраныя справы палітычных партый і грамадскіх аб’яднанняў. У той жа час, паколькі іх дзейнасць мае публічны характар, некаторыя пытанні, якія тычацца іх структуры і дзейнасці, рэгулююцца заканадаўствам.

Згодна з арт. 1 Закона «Аб палітычных партыях», палітычная партыя -- гэта незалежнае, утворанае на аснове індывідуальнага добраахвотнага сяброўства аб’яднанне грамадзян, якое дзейнічае ў рамках Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь, садзейнічае выяўленню і выказванню

палітычнай волі грамадзян і ўдзельнічае ў выбарах. У адрозненне ад іншых грамадскіх аб'яднанняў, партыі актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны, перш за ўсё, праз удзел у выбарах, фарміраванні грамадскай думкі па найбольш важных для дзяржавы і грамадства пытаннях. Розныя партыі прапагандуюць і выказваюць інтарэсы прадстаўляемых імі груп.

Ні адна партыя ў Беларусі не мае права манапалізаваць уладу і зрабіць сваю ідэалогію дзяржаўнай, г.зн. абавязковай для ўсіх грамадзян. Структуры палітычных партый фарміруюцца толькі па тэрытарыяльным прынцыпе (у адрозненне ад структуры КПСС, якая фарміравалася таксама і па галіноваму прынцыпу, што гарантавала ёй наяўнасць парткамаў на прадпрыемствах і ва ўстановах). Згодна з законам, прыналежнасць або непрыналежнасць грамадзяніна да палітычнай партыі не можа служыць падставай для абмежавання яго правоў і свабод, роўна як для прадастаўлення яму дзяржаўных ільгот і пераваг. Патрабаванне аб ўказанні ў афіцыйных дакументах на членства ў партыі не дапускаецца.

Заснавальнікамі партыі могуць быць толькі грамадзяне Беларусі, якія дасягнулі 18 гадоў, валодаюць выбарчым правам, не абмежаваны судом у дзеяздольнасці і не знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. Для стварэння палітычнай партыі неабходна, каб яна мела не менш за 1000 заснавальнікаў. Стварэнне ў Беларусі партый іншых дзяржаў не дапускаецца. Члены палітычных партый маюць права свабоднага выхаду з яе.

Членамі палітычных партый не могуць бытъ:

- суддзі;
- пракурорскія работнікі;
- супрацоўнікі органаў унутраных спраў;
- супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю;
- супрацоўнікі органаў бяспекі;
- вайскоўцы і асобы, на якіх распаўсюджваецца статус ваеннаслужачых;
- Прэзідэнт і члены Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Рэспублікі Беларусь (да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў).

Абмежаванне дзейнасці палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў агаворваецца ў арт. 5 Канстытуцыі: «*Забараняецца стварэнне і дзейнасць палітычных партый, а таксама іншых грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць на мэце гвалтоўнае змяненне канстытуцыйнага ладу ці вядуць прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці*». Удзел у дзейнасці незарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў таксама забаронены.

Маналікасць і слабы ўплыў партый на ідэалагічныя працэсы ў беларускім грамадстве абумоўлены адсутнасцю сацыяльнай базы для дзейснай партыйнай сістэмы, слабасцю матэрыяльнай і матэрыяльна-тэхнічнай базы партый, неспрыяльным для іх дзейнасці заканадаўствам, асаблівасцю палітычнай культуры беларускага насельніцтва і палітычнымі памылкамі саміх партыйных лідараў.

*Грамадскія аб'яднанні.*

У беларускім заканадаўстве грамадскае аб'яднанне вызначаецца як добраахвотнае фарміраванне грамадзян, якое яны ўтварылі на аснове агульнасці інтарэсаў для сумеснай рэалізацыі грамадзянскіх, эканамічных, сацыяльных і культурных правоў (арт. 1 закона «Аб грамадскіх аб'яднаннях»).

Адметнай рысай гэтага віду фарміраванняў з'яўляецца тое, што яны: а) не пераследуюць камерцыйных мэтаў; б) не ставяць у якасці мэты і асноўнага сродку сваёй дзейнасці ўдзел у палітыцы. Функцыі грамадскіх аб'яднанняў у супольнасці звязаны з выяўленнем і задавальненнем патрэб розных груп грамадства з дапамогай сумеснай дзейнасці.

Згодна з заканадаўствам, у Рэспубліцы Беларусь могуць стварацца 3 віды грамадскіх аб'яднанняў:

- рэспубліканскія, дзейнасць якіх распаўсюджваецца на тэрыторыю ўсёй Рэспублікі Беларусь і якія маюць заснавальнікаў у большасці яе абласцей;

- міжнародныя, дзейнасць якіх распаўсюджваецца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь (адной або некалькіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак) і тэрыторыю адной або некалькіх замежных дзяржаў, якія маюць адпаведныя грамадскія аб'яднанні;

- мясцовыя, дзейнасць якіх распаўсюджваецца на тэрыторыю адной або некалькіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

Асаблівае месца сярод грамадскіх аб'яднанняў займаюць прафсаюзы. Прафсаюз – аб'яднанне работнікаў, створанае імі для абароны сваіх інтарэсаў, перш за ўсё для паляпшэння ўмоў і павышэння аплаты працы.

Найбуйнейшым прафсаюзным аб'яднаннем у Беларусі з'яўляецца Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі (ФПБ), якая, паводле статуту, з'яўляецца рэспубліканскім добраахвотным незалежным аб'яднаннем прафесійных саюзаў (нацыянальным прафцэнтрам). Агульная колькасць членаў ФПБ -- больш за 4 млн чалавек. ФПБ аб'ядноўвае 32 галіновых прафсаюза, 6 абласных аб'яднанняў прафсаюзаў, 1 гарадское аб'яднанне прафсаюзаў і 2 прафсаюза работнікаў прадпрыемстваў. Ва ўласнасці ФПБ знаходзіцца каля 900 клубаў, больш за 500 бібліятэк, больш за 5000 лагераў адпачынку.

Сярод маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў найбуйнейшымі з'яўляюцца Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя.

Такім чынам, шматпартыйная сістэма як пастаянны фактар універсальнасці і дэмакратычнасці грамадскага ладу знаходзіцца ў Беларусі яшчэ на этапе станаўлення. Яе фарміраванне -- гэта доўгі і супярэчлівы працэс. Рэальны стан палітычнага спектра будзе вызначацца не ўсім наяўным станам партый, а толькі тымі з іх, якія заваююць давер народа, уключацца ў сістэму ўлады і змогуць уплываць на ход і ажыццяўленне грамадскіх і дзяржаўных спраў, на рашэнне найважнейшых праблем, якія стаяць перад грамадствам.